ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 10(948) | АЎТОРАК, 26 мая 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## МАЦНЕЦЬ САЮЗУ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Амаль за тры дзесяцігоддзі існавання нашага універсітэта ў яго гісторыі было нямала знамянальных падзей. Але, бадай, адной з самых яркіх стала тая, што адбылася ў бягучым месяцы -- 5-га мая. У гэты дзень у актавай зале ГДУ выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты ўсіх шасці ВНУ Гомельшчыны сустрэліся з кіраўнікамі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Высокіх гасцей, якім студэнткі ў нацыянальных касцюмах уручылі хлеб і соль, сустракалі прадстаўнікі рэктарата і грамадскіх арганізацый.

У фае вучэбнага корпуса N1 была наладжана выстаўка навуковых выданняў вучоных і супрацоўнікаў нашага універсітэта. З яе экспанатамі гасцей пазнаёміў рэктар член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў, які расказаў аб дасягненнях навукоўцаў вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся.

У запоўненай актавай зале гасцей сустрэлі бурнымі апладысментамі. Рэктар Л.А.Шамяткоў прадставіў прысутным старшыню Дзяржаўнай Думы Расійскай Федэрацыі, старшыню Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі Г.М.Селязнёва, яго намесніка, старшыню Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А.А.Малафеева,пасла Расіі ў Беларусі В.В.Лашчыліна, міністра адукацыі нашай краіны В.І.Стражава, старшыню Гомельскага аблвыканкома М.Р.Вайцянкова, старшыню абласнога Савета дэпутатаў В.С.Сяліцкага, старшыню Гомельскага гарвыканкома А.С.Якабсона, рэктараў ВНУ Гомельшчыны.

Пасля прывітальнага слова Л.А.Шамяткоў сказаў аб тым, што наш горад стаў своеасаблівай сталіцай 8-га Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Гэта стала сапраўды гістарычнай падзеяй. Леанід Аляксандравіч падкрэсліў важнасць далейшага ўмацавання саюза двух брацкіх народаў і пашырэння яго межаў, плённага



супрацоўніцтва ў дзейнасці ва ўсіх сферах, у тым ліку ў навуковай і падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

У сваім выступленні Л.А.Шамяткоў значную ўвагу ўдзяліў дасягненням узначальваемага ім універсітэта, дыпломы якога атрымала ўжо звыш 30 тыс. выпускнікоў. Яны плённа працуюць не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі.

З выключнай цеплынёй быў сустрэты залай Г.М.Селязнёў. Старшыня Парламенцкага сходу Саюза адзначыў, што Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка прыкладае велізарныя намаганні для з'яднання дзвюх брацкіх дзяржаў. "Калі б такая ж воля была і з другога боку, -- сказаў Г.М.Селязнёў, -- дык рамкі Саюза былі б сёння значна шырэйшымі". Імкненні расіян жыць у саюзе з Беларуссю, па яго словах, неаспрэчныя. Ён таксама адзначыў, што ў выпадку рэферэндума да 70% жыхароў Расійскай Федэрацыі прагаласавалі б за адзінства з Беларуссю. Аднак, на яго думку, мадэль мяркуемага яднання -- канфедэрацыя ці федэрацыя -- патрабуе далейшага асэнсавання.

На сустрэчы Г.М.Селязнёву было зададзена шмат пытанняў. На кожнае з іх, у тым ліку, якія тычыліся чарнобыльскай трагедыі, аўтары атрымалі вычарпальныя адказы. Прагучала запэўніванне, што ў вырашэнні гэтай праблемы Беларусь можа разлічваць на дапамогу расіян. У прыватнасці, плануецца агульнымі намаганнямі дабудаваць цэнтр радыяцыйнай медыцыны ў Гомелі.

З асаблівай цеплынёй і прыхільнасцю Г.М.Селязнёў гаварыў аб гамяльчанах, якія мужна пераносяць цяжкія наступствы чарнобыльскай трагедыі. "Мы ўбачылі, што горад жыве і працуе, што няма ніякай панікі і ніхто нікуды не збіраецца з'ехаць. Для многіх расійскіх дэпутатаў гэта стала сапраўдным адкрыццём," -- зазначыў Генадзь Мікалаевіч.

Пад заканчэнне сустрэчы, на якой адбылася на рэдкасць адкрытая размова, Л.А.Шамяткоў уручыў Г.М.Селязнёву сярэбраны значок з адлюстраваннем Ф.Скарыны, энцыклапедычны даведнік "Францыск Скарына" і кнігу крылатых выказванняў на лацінскай, рускай і беларускай мовах. Маскоўскі госць падарыў універсітэту кнігу аб Дзярждуме другога склікання і сувенірнае выданне "Истории государства Российского".

**Б.ВАЛОДЗІН.**

**На здымку: запамінальны момант сустрэчы. Справа Г.М.Селязнёў. Фота У.Чысціка.**

## "ВАХТА ПЕРАМОГІ І ДРУЖБЫ НАРОДАЎ"

Такую назву насіла акцыя-агітпрабег, прысвечаная 53-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Яна пачалася 1 мая ў Маскве і на працягу двух тыдняў праходзіла па многіх гарадах трох рэспублік -- Расіі, Украіны і Беларусі. Яе арганізатарамі былі саюзы афіцэраў і ветэранскія арганізацыі гэтых краін.

Удзельнікі агітпрабегу -- ваеннаслужачыя, ветэраны, моладзь ставілі галоўнай мэтай акцыі агітацыю трох славянскіх народаў на ўз'яднанне, выхаванне ў юнакоў і дзяўчат пачуцця патрыятызму. Шмат сустрэч з людзьмі розных узростаў адбылося на доўгім маршруце прабегу, які склаў каля 2 тысяч кіламетраў.

У адзін з майскіх дзён удзельнікі акцыі завіталі ў г.Гомель. Тут яны сустракаліся з навучэнцкай і студэнцкай моладдзю, і ў тым ліку нашага універсітэта.

Перад студэнтамі ГДУ выступілі старшыня Савета ветэранаў Беларусі генерал-лейтэнант, заслужаны лётчык СССР, акадэмік Міжнароднай славянскай акадэміі навук Д.А.Іваноў, старшыні саюзаў афіцэраў Расіі, Украіны, Гомельскай вобласці С.М.Церахаў, А.У.Агароднікаў, В.П.Шамшура і інш. Яны выказалі занепакоенасць сённяшнім станам эканомікі славянскіх дзяржаў, а ў выніку, нізкім жыццёвым узроўнем іх народаў, адсутнасцю ў моладзі дакладных маральных арыенціраў, пачуцця любві да сваёй Радзімы.

Праведзеная сустрэча, у час якой выступіў рэктар нашага універсітэта Л.А.Шамяткоў, і ўдзел у якой прынялі кіруючыя работнікі вобласці, прадстаўнікі маладзёжных арганізацый, будзе садзейнічаць адраджэнню тых ідэй, якія звязваюць нашы славянскія народы.

**(Наш кар.)**

## ДЫПЛАМАНТЫ Ў ТРЭЦІ РАЗ

Фестываль "Студэнцкая вясна" штогод збірае ў г.Віцебску шматлікія творчыя маладзёжныя калектывы рэспублікі. Наш універсітэт таксама прадстаўляў у горадзе над Дзвіной свае студэнцкія таленты.

Сёлета на фестываль адправіліся тры калектывы ГДУ -- народная харавая капэла "Дзянніца", народны тэатр-студыя "Если бы..." і СТЭМ.

Найбольш удалым на "Студэнцкай вясне-98" было выступленне харавой капэлы пад кіраўніцтвам Мікалая Казлова, якая ў намінацыі "Харавыя калектывы" заняла 2-ое месца і атрымала адпаведны Дыплом. Гэты калектыў ужо ў трэці раз становіцца дыпламантам віцебскага фестывалю.

Усяго на "Студэнцкай вясне" прадстаўлялі сваё майстэрства звыш 90 калектываў, у якія ўваходзіць 2400 чалавек.

## РАБІЦЕ ВАШЫ СТАЎКІ, ПАВАЖАНЫЯ ЗНАЎЦЫ!

У Гомелі адбыўся VII міжнародны турнір па інтэлектуальных гульнях "Што?Дзе?Калі?" і "Брэйн-рынг" "Кубак Палесся", у якім удзельнічалі 49 каманд з усіх куткоў Беларусі, а таксама з Расіі і Украіны. Сярод іх былі і такія "зоркі", як першы чэмпіён Беларусі на тэлегульні "Рызыка-версія" "Зялёны Змій" (Гомель, капітан Аляксей Кавалёў), 2-гі чэмпіён Беларусі па "Што? Дзе? Калі?" "Джокер" (Магілёў, капітан Міхаіл Саўчанкоў), 3-ці чэмпіён Беларусі па "Што?Дзе?Калі?" "Хатні Бусел" (Гомель, Аляксандр Ерафееў), пераможцы піцерскіх "Белых начэй" 1996г. "Злавесныя Сухары" (Гомель, Анатоль Мядзведзеў). Гульні праводзіў добра знаёмы вам па "Рызыцы-версіі", "Брэйн-рынгу" і Элітарнаму Клубу "Што?Дзе?Калі?" бліскучы вядучы Леанід Клімовіч. Суддзейства ажыццяўляў таксама ігрок Элітарнага Клуба, неаднаразовы чэмпіён "Брэйн-рынга" Сяргей Віваценка.

Вельмі добрае ўражанне пакінула цікавае шоу-адкрыццё, якое складалася з мноства забаўляльных гульняў, якія чаргаваліся з выступленнямі гомельскага рок-гурту "Арцель".

У "Што?Дзе?Калі?" 1-ае месца занялі "Злавесныя Сухары" (43 правільныя адказы на 60 пытанняў), а ў "Брэйн-рынгу" перамог "Джокер".

У юнацкіх спаборніцтвах Кубак на "Што?Дзе?Калі?" атрымаў гродзенскі "Губертус", а на "Брэйн-рынгу" -- гомельскі "Карыес".

У многіх гомельскіх камандах, якія прымалі ўдзел у "Кубку Палесся",сярод знаўцаў былі і студэнты ГДУ. У "Менталітэце" Аляксея Чыстова, які ўвайшоў у васьмёрку лепшых, гуляюць Васіль Шкуратаў (фізічны факультэт) і Раман Якімец (гісторыка-юрыдычны факультэт), у "Вікторыі Назаўсёды" -- Кіра Іванова (філфак), у "Спартаку" -- Марына Арончык (філфак) і Аляксей Гаўрыкаў (гісторыка-юрыдычны факультэт), у "Зялёным Зміі" -- Дзмітрый Карасёў (гісторыка-юрыдычны факультэт) і Дзмітрый Спектар (геолага-геаграфічны факультэт), у "Хатнім Бусле" -- (ІІ-ое месца на "Што?Дзе?Калі?") -- Алена Афанасьева (матфак).

**Павел КУЗНЯЦОЎ, студэнт гр. А-15 філалагічнага факультэта.**

## ВЕТЭРАНЫ -- МОЛАДЗІ

Напярэдадні Дня Перамогі над фашысцкай Германіяй у студэнтаў І курса беларускага аддзялення філалагічнага факультэта адбылася цікавая сустрэча з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны Міхаілам Афанасьевічам Дзмітрыевым, Сямёнам Фёдаравічам Шакаравым, Аляксандрам Аляксеевічам Косцікавым. Кожны з гэтых людзей расказваў пра свой лёс, пра вайну, пра сваю адданасць Радзіме. М.А.Дзмітрыеў падкрэсліў, што час, у якім патрэбна будзе жыць сённяшняй моладзі, -- гэта час "трэцяй сусветнай вайны", але ў плане не фізічнага гвалту, а маральнага.

Скончылася сустрэча вялікай падзякай ветэранам, пажаданнем ім шчасця і здароўя. С.Ф.Шакараў падараваў студэнтам дзве свае кнігі з асабістым подпісам.

Сустрэча была падрыхтавана дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі Т.І.Язэпавай.

**Ірына ПЯТРУК, студэнтка гр. Б-11 філалагічнага факультэта.**

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі, дэканат і кафедры матэматычнага факультэта, увесь калектыў універсітэта віншуюць першага прарэктара, прарэктара па вучэбнай рабоце, прафесара кафедры алгебры і геаметрыі СЕЛЬКІНА Міхаіла Васільевіча з паспяховай абаронай у Інстытуце матэматыкі і механікі Уральскага навуковага цэнтра Расійскай акадэміі навук дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.*

# ЛАУРЕАТЫ СКОРИНИНСКИХ НАУЧНЫХ ЧТЕНИЙ --98

**Победителями конкурса на лучшую научно-исследовательскую работу и лауреатами Скорининских научных чтений 1998 года в нашем университете стали:**











**ВАСИЛЬЕВ АЛЕКСАНДР ФЕДОРОВИЧ** -- кандидат физико-математических наук, доцент кафедры алгебры и геометрии. Цикл работ "Исследования по проблеме различимости и перечисления в теории классов групп".

"Проблема различимости и перечисления" — это термин, объединяющий одно из современных направлений теории групп, связанное с изучением приводящих к одному и тому же теоретико-групповому факту или конструкции классов групп (формаций, классов Шунка, классов Фиттинга). Общая концепция и серия конкретных задач этого направления была предложена Л.А.Шеметковым во второй половине 80-х годов. В 90-е годы исследования по данной тематике бурно развиваются, вовлекая в свои круги не только гомельских алгебраистов, но и зарубежных математиков.

В вышеназванном цикле работ нашли отражение некоторые результаты автора по данной проблематике, опубликованные им за последние пять лет.

А.Ф.Васильевым был получен целый ряд глубоких результатов, связанных с исследованием вопросов различимости и перечисления классов групп по заданным свойствам. Им получено решение ряда открытых, трудных проблем. Результаты исследований опубликованы в более чем 30 научных работах, среди которых статьи в научно-исследовательских журналах "Математические заметки", "Известия высших учебных заведений", "Доклады НАН Беларуси", "Известия НАН Беларуси" и др. Эти результаты получили высокую оценку со стороны известных специалистов по теории групп и неоднократно докладывались на республиканских и международных конференциях.

**КОВАЛЬЧУК ВИКТОРИЯ ВАЛЕРЬЕВНА** -- кандидат экономических наук, старший преподаватель кафедры бухгалтерского учета, контроля и анализа хозяйственной деятельности. Монография "Анализ внешнеторговых связей".

Монография написана на материале научных исследований, полученных при подготовке кандидатской диссертации. Ее содержание отражает процессы внешнеторговых связей региона, в частности, Гомельской области. Это придает работе характер новизны, так как изучение таких проблем на уровне области с определенными выводами и рекомендациями является затруднительным и ответственным. Автор анализирует многие подходы и предлагает свою систему показателей оценки внешнеторговых связей.

В монографии содержатся новые научно обоснованные методические разработки в области анализа внешнеэкономических связей региона с зарубежными странами.

Разработана новая методика оценки эффективности внешнеторговой деятельности региона, основанная на использовании ряда показателей: коэффициента сбалансированности внешнеторговой деятельности, формулы эффективности вклада компонентов, функции внешнеторговой деятельности региона и др.

Предложенная методика позволяет проводить анализ уровня развития внешнеторговых связей региона с ограниченным кругом статистических данных, основными из которых являются стоимостные и количественные показатели экспорта и импорта, выраженные в ценах соответствующих лет.

Монография предназначена для органов государственного управления, служб внешнеэкономической деятельности предприятий, для проведения анализа эффективности ВЭД с целью выработки основных направлений развития внешних связей, а также для студентов и аспирантов высших учебных заведений.

**КАРОПА ГЕННАДИЙ НИКОЛАЕВИЧ** -- кандидат педагогических наук, доцент кафедры географии. Цикл работ "Системный подход к экологическому образованию и воспитанию".

Цикл научных и учебно-методических работ по данной теме включает в себя 34 публикации и посвящен проблеме создания новой парадигмы экологического образования и воспитания учащейся молодежи, а также исследованию психолого-педагогических основ формирования у нее норм ответственного отношения к природе.

Идеи и теоретические положения новой парадигмы экологического образования переведены автором на уровень частной методики и нашли свое отражение в многочисленных учебных пособиях, рекомендациях и практикумах, опубликованных в республиканской и зарубежной печати. Создаваемая автором новая парадигма экологического образования базируется на положении научной психологии о том, что "всякое отношение ребенка к внешнему миру оказывается всегда отношением, преломленным через его отношение к близкому взрослому" (Л.Выготский), а также на новом понимании и интерпретации принципов деятельности, моделирования, наглядности и др. Чрезвычайно важным в разрабатываемой концепции является принцип системной дифференциации когнитивных структур (Пиаже, Чуприкова и др.).

Основные положения исследовательской работы Г.Н.Каропы докладывались им на многочисленных международных конгрессах, конференциях и семинарах, проходивших в Канаде, Германии, Великобритании, России, Латвии, Украине и др., а также раскрывались в зарубежной педагогической литературе (США, Франция, Канада и др.).

**КОВАЛЬ ВЛАДИМИР ИВАНОВИЧ** -- кандидат филологических наук, доцент кафедры русского, общего и славянского языкознания. Монография "Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі".

Монография посвящена систематизированному описанию важнейших фрагментов восточнославянской мифологии -- традиционных народных представлений об окружающей действительности и отражению этих представлений в языке. Опираясь на многочисленные материалы различных этнографических, мифологических и лингвистических источников, а также на данные словарей, справочников и энциклопедий, автор излагает сведения о мифологии -- совокупности представлений наших предков о природе и природных явлениях, основанных на языческих верованиях: о мифических персонажах, животных, растениях, о различных предметах, стихиях, отвлеченных понятиях и терминологии народного календаря. Всего в работе охарактеризовано более 180 мифонимов. В качестве источников использована в основном малодоступная для современного читателя литература, в том числе и изданная в дореволюционный период. Мифология характеризуется в работе как своеобразный "инструмент", позволяющий исследовать внутреннюю форму немотивированных слов и устойчивых словосочетаний, адекватно оценивать содержание художественных, фольклорных и сакральных текстов.

Монография используется в качестве учебного пособия по курсу "Восточнославянская мифология" для студентов филологических факультетов университетов Беларуси. Это единственное в Беларуси пособие по данному курсу.

**МИРОТИН АДОЛЬФ РУВИМОВИЧ** -- кандидат физико-математических наук, доцент кафедры высшей математики. Цикл работ "Функциональные исчисления в банаховых алгебрах и теорема Пэли-Винера".

Теория банаховых алгебр возникла в 40-е годы в работах И.М.Гельфанда и др. первоначально как теория коммутативных алгебр. В дальнейшем стала развиваться и теория некоммутативных банаховых алгебр. Первая часть данной работы относится именно к этому направлению функционального анализа. В ней строятся функциональные исчисления диссипативных элементов банаховой алгебры, которые позволяют распознавать и строить диссипативные операторы в банаховых пространствах, а также использовать при их изучении методы теории функций. В частности, на этом пути решается вопрос о совпадении нормы и спектрального радиуса операторов, являющихся функциями диссипативных операторов.

Вторая часть работы посвящена перенесению классической теоремы Пэли-Винера для функций на полуоси на функции на конусе в произвольной локально компактной абелевой группе. В ней описывается Фурье-образ пространства квадратично интегрируемых функций на таких конусах, что приводит, в частности, к интегральным представлениям Коши-Бохнера, Пуассона и Сеге для соответствующих пространств Харди. Ранее это было сделано лишь для конусов в конечномерных пространствах и в линейно упорядоченных дискретных абелевых группах.

Указанные результаты опубликованы в таких серьезных журналах как "Математические заметки", "Сибирский математический журнал", "Известия вузов", "Известия АН Беларуси" и докладывались на нескольких всероссийских и международных конференциях.

**О.СКРЕЖЕНДЕВСКАЯ,**
**ведущий инженер информационной службы НИСа.**

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

**АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1.1. Гэты калектыўны дагавор заключаецца паміж калектывам супрацоўнікаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, які прадстаўлены прафсаюзным камітэтам і адміністрацыяй універсітэта, якая прадстаўлена рэктарам.

1.2. Дагавор з'яўляецца нарматыўным актам і рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж адміністрацыяй ГДУ і работнікамі працоўнага калектыву, які налічвае 1161 чал.

1.3. Пагадненне паміж рэктарам і прафкомам студэнтаў па сацыяльна-эканамічных пытаннях з'яўляецца дадаткам да калектыўнага дагавора.

1.4. Дагавор заключаецца ў пісьмовай форме на два гады на падставе Закона РБ "Аб калектыўных дагаворах і пагадненнях", Указа Прэзідэнта РБ "Аб развіцці сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь" і "Пагадненне паміж Міністэрствам адукацыі і Рэспубліканскім камітэтам прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі" і ўключае ў сябе:

-- абарону сацыяльна-эканамічных інтарэсаў работнікаў;

-- раўнапраўе бакоў;

-- улік рэальных магчымасцей матэрыяльнага, вытворчага і фінансавага забеспячэння прымаемых абавязацельстваў.

1.5. Калектыўны дагавор уступае ў сілу з моманту яго падпісання і дзейнічае да заключэння новага. Адміністрацыя абавязана азнаёміць усіх работнікаў, у тым ліку ўпершыню прынятых, з дзейнічаючым калектыўным дагаворам, для чаго размножыць яго і ў месячны тэрмін забяспечыць ім структурныя падраздзяленні і службы універсітэта.

1.6. Адміністрацыя абавязуецца інфармаваць прафком і супрацоўнікаў універсітэта аб усіх рашэннях, якія прымаюцца: размеркаванне жылля, фондавага забеспячэння, прэміраванне і г.д.

1.7. Змяненні і дапаўненні калектыўнага дагавора, пры пагадненні бакоў, уносяцца на працягу яго тэрміну дзеяння на пашыраным пасяджэнні Савета універсітэта і прафкома.

1.8. Вядзенне перамоў на раўнапраўнай аснове, падрыхтоўку і кантроль за выкананнем калектыўнага дагавора ажыццяўляе камісія

(Працяг на 3-й стар.)

(Працяг. Пачатак на 2-й стар.)

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

ўпаўнаважаных прадстаўнікоў адміністрацыі і прафкома. З боку рэктара: Кармазін А.П., прарэктар па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях; Палевікоў У.М., прарэктар па АГР; Пашук С.Я., начальнік (кіраўнік) планава-фінансавага аддзела; прафкома: Варатніцкі Г.І., старшыня прафкома; Балога У.П., рэдактар газеты "Гомельскі універсітэт"; А.Л.Вайцішкіна, ст.выкладчыца эканамічнага факультэта. Тэрміны вядзення перамоў не могуць быць перавышаны больш за адзін месяц.

1.9. Бакі абавязуюцца кожнае паўгоддзе разглядаць ход выканання калектыўнага дагавора на сумесных пасяджэннях Савета універсітэта і прафкома і аб выніках інфармаваць калектыў праз газету "Гомельскі універсітэт".

1.10. Рэктарат пасля падпісання калектыўнага дагавора ў двухдзённы тэрмін выдае загад аб арганізацыі выканання мерапрыемстваў, якія ўваходзяць у дагавор.

1.11 Калектыўны дагавор падпісваецца рэктарам і старшынёй прафкома.

1.12. Асобы, вінаватыя ў невыкананні (парушэнні) умоў калектыўнага дагавора, могуць быць пазбаўлены часткова або поўнасцю прэміі, а таксама на іх можа быць накладзена дысцыплінарнае спагнанне.

## 2. АРГАНІЗАЦЫЯ І АПЛАТА ПРАЦЫ

2.1. Адміністрацыя універсітэта абавязуецца не дапускаць вучэбную нагрузку больш 6 аўдыторных гадзін па асноўнай рабоце і 9 гадзін -- з улікам сумяшчальніцтва, правядзення больш аднаго экзамена ў дзень. Работы ў выхадныя дні дапускаць у выключных выпадках, афармляючы ў адпаведнасці з КЗаП Рэспублікі Беларусь.

**Адказн**. Папкова Н.І., заг. кафедрамі, пастаянна.

2.2. З мэтай паляпшэння ўмоў працы і вучобы студэнтаў, санітарна-гігіенічнага стану памяшканняў, рацыянальнага выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы, дэканам факультэтаў сваім распараджэннем замацаваць аўдыторны фонд за студэнцкімі групамі.

**Адказн**. Папкова Н.І., дэканы факультэтаў, пастаянна.

2.3. Сярэдні аб'ём вучэбнай нагрузкі выкладчыкам на навучальны год устанаўліваць з улікам агульнай колькасці вучэбнай нагрузкі па універсітэту і пагадзіннага фонду, зацверджанага Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Адказн.** Пашук С.Я., Папкова Н.І., штогод.

2.4. Па рашэнню кафедр дазволіць штатным супрацоўнікам універсітэта, якія не маюць сумяшчальніцтва, выкананне пагадзіннай нагрузкі ў аб'ёме да 0,5 штатнай вучэбнай нагрузкі.

**Адказн.** Кармазін А.П., Папкова Н.І., на працягу года.

2.5. Забяспечыць выкананне правілаў унутранага распарадку і захаванне працоўнай дысцыпліны выкладчыкамі і супрацоўнікамі. Адзін раз у месяц праводзіць выбарачную праверку захавання дысцыпліны ў структурных падраздзяленнях з апублікаваннем яе вынікаў у друку.

**Адказн.** аддзел кадраў, прафком, кіраўнікі структурных падраздзяленняў, на працягу года.

2.6. Своечасова даводзіць да кожнага супрацоўніка пад распіску пасадавыя функцыянальныя абавязкі.

**Адказн.** кіраўнікі падраздзяленняў, пастаянна.

2.7. Забараніць выкарыстанне ў рабочы час рабочых і служачых на работах, не звязаных з іх службовымі абавязкамі.

**Адказн.** рэктарат, прафком, на працягу года.

2.8. Адміністрацыя універсітэта і прафком абавязуюцца абараняць існуючую рэдакцыю абзаца 7 арт. 34 Закона "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

**Адказн**. Шамяткоў Л.А., Варатніцкі Г.І.

2.9. Аплату працы выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта праводзіць у адпаведнасці з зацверджанымі акладамі і тарыфнымі стаўкамі па дзеючаму заканадаўству. Выплату заработнай платы пры своечасовым фінансаванні праводзіць: аванс і пагадзінную аплату -- з 18 числа, разлік за месяц -- з 3 числа наступнага месяца.

**Адказн.** Курава І.А., Пашук С.Я.

2.10. Выдачу разліковых лісткоў праводзіць па ўсіх відах заработнай платы.

**Адказн.** Курава І.А.

2.11. Адміністрацыя абавязуецца ў межах сродкаў, якія накіроўваюцца на аплату працы:

2.11.1. Устанаўліваць даплаты работнікам, якія заняты на работах з неспрыяльнымі ўмовамі працы ў памеры 0,14-0,31% месячнай тарыфнай стаўкі першага разраду за кожную гадзіну работы ў гэтых умовах працы.

**Адказн**. Шамяткоў Л.А., Курава І.А., Пашук С.Я., Яўстраценка А.В.

2.11.2. Прымяняць даплаты работнікам за работу ў начны час у памеры 0,53% тарыфнай стаўкі першага разраду за кожную гадзіну работы ў начны час з 22 гадзін да 6 гадзін раніцы. Памеры гэтых даплат на работах у надзвычайных сітуацыях, на якіх напружанне, інтэнсіўнасць, небяспека працы ў начны час павышаюцца (ліквідацыя аварый, стыхійных бедстваў), могуць павялічвацца да 1,05 %.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.11.3. Выплачваць вадзіцелям грузавых і легкавых аўтамабіляў, аўтобусаў штомесячныя надбаўкі за класнасць: вадзіцелям 2-га класа ў памеры 10% і вадзіцелям 1-га класа -- 25% устаноўленай тарыфнай стаўкі за адпрацаваны ў якасці вадзіцеля час.

**Адказн**. Палевікоў У.М., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.11.4. Устанаўліваць даплаты вадзіцелям легкавых аўтамабіляў за ненарміраваны рабочы дзень у памеры да 25% тарыфнай стаўкі за адпрацаваны час.

**Адказн**. Палевікоў У.М., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.11.5. Вызначаць даплаты брыгадзірам з ліку рабочых, не вызваленых ад асноўнай работы, за кіраўніцтва брыгадай у памеры да 25% ад тарыфнай стаўкі першага разраду ў залежнасці ад колькасці брыгады (брыгады ствараюцца пры колькасці не менш 5 чалавек).

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.11.6. Прымяняць месячныя аклады замест тарыфных ставак высокакваліфікаваным рабочым, занятым на асабліва важных і адказных работах, зыходзячы з тарыфнай стаўкі першага разраду і ўстаноўленага каэфіцыента.

**Адказн**. Палевікоў У.М., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.11.7. Устанаўліваць надбаўкі кіраўнікам, спецыялістам і служачым за высокія творчыя, вытворчыя дасягненні ў рабоце або за выкананне асабліва важных (тэрміновых) работ у памеры да 50% пасадавага акладу (стаўкі), накіроўваючы на гэтыя мэты 10% планавага фонду заработнай платы штатных работнікаў (без уліку фонду зарплаты рабочых) і кіруючыся пры гэтым "Палажэннем аб матэрыяльным стымуляванні працы работнікаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны" (дадатак N1).

**Адказн.** Шамяткоў Л.А., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.11.8. З мэтай стымулявання павышэння прафесійнага майстэрства рабочых і ўзмацнення іх матэрыяльнай зацікаўленасці і адказнасці за выкананне вытворчых заданняў уводзіць дыферэнцыраваныя надбаўкі да іх тарыфных ставак за прафесійнае майстэрства для 3-га разраду -- 12%, 4-га разраду -- да 16%, 5-га разраду -- да 20%, 6-га разраду -- да 24%, 7-га разраду -- да 28%, 8-га разраду -- да 32% адпаведнай тарыфнай стаўкі.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.11.9. Устанаўліваць даплаты за сумяшчэнне прафесій (пасад), пашырэнне зоны абслугоўвання або павелічэнне аб'ёму выконваемых работ спецыялістам і служачым у памеры да 50% акладу (стаўкі) па сумяшчаемай пасадзе, а рабочым -- не больш 70% тарыфнай стаўкі (акладу) па сумяшчаемай прафесіі.

**Адказн.** Шамяткоў Л.А., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.11.10. Уводзіць даплаты рабочым, спецыялістам і служачым за выкананне разам са сваёй асноўнай работай абавязкаў работніка, які часова адсутнічае. Даплаты ўводзяцца ў межах тарыфнай стаўкі (акладу) работніка, які адсутнічае, зыходзячы з фактычна выконваемага за яго аб'ёму работ.

**Адказн.** Шамяткоў Л.А., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.11.11. Павышаць тарыфныя стаўкі і аклады, разлічаныя ў адпаведнасці з устаноўленай тарыфнай стаўкай першага разраду, за стаж работы па спецыяльнасці (у галіне) у наступных памерах:

ад 1 да 5 гадоў -- 5 працэнтаў;

ад 5 да 10 гадоў -- 10 працэнтаў;

ад 10 да 15 гадоў -- 15 працэнтаў;

ад 15 гадоў і вышэй -- 20 працэнтаў.

**Адказн.** Шамяткоў Л.А, Курава І.А., Пашук С.Я.

2.11.12. Праводзіць прэміраванне работнікаў, накіроўваючы на гэтыя мэты выдзяляемыя з бюджэту сродкі ў памеры 10% планавага фонду заработнай платы штатных супрацоўнікаў і эканоміі сродкаў, прадугледжаных на аплату працы, на падставе "Палажэння аб матэрыяльным стымуляванні работнікаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны" (дадатак N1).

**Адказн.** Шамяткоў Л.А., Курава І.,А., Пашук С.Я.

2.11.13. Прадугледжваць сродкі на аказанне матэрыяльнай дапамогі ў памеры 5% планавага фонду заработнай платы штатных работнікаў. Аказанне матэрыяльнай дапамогі работнікам праводзіць у адпаведнасці з "Палажэннем аб аказанні матэрыяльнай дапамогі супрацоўнікам Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны" (дадатак N2).

**Адказн.** Шамяткоў Л.А., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.12. Умовы аплаты працы, названыя ў пункце 2.11., распаўсюджваюцца з 1 студзеня 1998 года не толькі на работнікаў універсітэта, фінансуемых за кошт бюджэтных асігнаванняў, але таксама на работнікаў, якія ўтрымліваюцца за кошт сродкаў пазабюджэтнай дзейнасці.

**Адказн.** Шамяткоў Л.А., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.13. Аплата працы работнікаў гасразліковага падраздзялення па пазабюджэтнай дзейнасці "Прадпрыемствы грамадскага харчавання" праводзіцца на падставе Адзінай тарыфікацыйнай сеткі работнікаў Рэспублікі Беларусь і рэкамендацый па яе прымяненню, зацверджаных пастановай Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 1998 года N2.

Стаўка 1-га разраду ўстанаўліваецца зыходзячы з фінансавых магчымасцей прадпрыемства пры ўмове павышэння эфектыўнасці і росту аб'ёмаў вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі за кошт уласных сродкаў. Перагляд стаўкі 1-га разраду ажыццяўляецца пры змяненні мінімальнай заработнай платы і павелічэнні стаўкі 1-га разраду ў бюджэтнай сферы. Умовы аплаты працы, названыя ў пункце 2.11., распаўсюджваюцца таксама на работнікаў "Прадпрыемстваў грамадскага харчавання" з 1 студзеня 1998 года зыходзячы са стаўкі 1-га разраду, устаноўленай для прадпрыемства.

**Адказн.** Курава І. А., Пашук С.Я., Соціева Т.М.

2.14. Адміністрацыя абавязуецца праводзіць аплату прастою не па віне работніка ў памеры 100% тарыфнай стаўкі (акладу).

**Адказн**. Курава І.А., Пашук С.Я.

2.15. Выплату адпускных праводзіць не пазней чым за дзень да пачатку водпуску.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

2.16. Не дапускаць, каб перапрацоўкі рабочага часу супрацоўнікаў, якія працуюць па графіках, перавышалі 120 гадзін у год, што ўстаноўлена арт.56 КЗаП Рэспублікі Беларусь.

**Адказн.** Кармазін А.П., Палевікоў У.М., Пашук С.Я.

2.17. Пры звальненні работніка выплата ўсіх сум, якія яму належаць, праводзіцца не пазней дня звальнення.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А.

2.18. Устанавіць, што для скарачаемых работнікаў у перыяд тэрміна папярэджання аб скарачэнні (2 месяцы) работнік выконвае свае працоўныя абавязкі, падпарадкоўваецца правілам унутранага распарадку, яму гарантуюцца ўмовы і аплата працы нароўні з іншымі працуючымі. Пры павышэнні заработнай платы скарачаемаму работніку зарплата павышаецца нароўні з тымі, хто застаецца ў штаце, а таксама захоўваюцца іншыя, прадугледжаныя сістэмай аплаты працы выплаты кампенсуючага і стымулюючага характару (надбаўкі, прэміі, даплаты).

**Адказн.** Кармазін А.П., Пашук С.Я.

2.19. Аплачваць у адпаведнасці з КЗаП Рэспублікі Беларусь звышурочныя работы работнікам з пачасовай аплатай працы, а таксама тых, хто атрымлівае пасадавыя аклады, -- не ніжэй двайных гадзінных ставак (акладаў).

**Адказн.** Курава І.А., Пашук С.Я.

## 3. ПРАВАВОЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАЦОЎНЫХ АДНОСІН, РАЗВІЦЦЁ САЦЫЯЛЬНАГА ПАРТНЁРСТВА

3.1. Пры падрыхтоўцы нарматыўных актаў, якія закранаюць сацыяльна-эканамічныя інтарэсы работнікаў універсітэта, іх прававое і эканамічнае становішча, даваць магчымасць камітэту прафсаюза прымаць удзел у распрацоўцы ўказаных актаў.

3.2. Своечасова накіроўваць камітэту прафсаюза загады, іншыя дакументы рэктарата, якія датычаць пытанняў умоў, арганізацыі, аховы і аплаты працы, сацыяльна-эканамічнага становішча работнікаў універсітэта.

3.3. Нарматыўныя акты па пытаннях аплаты, нарміравання і аховы працы, працоўных праваадносін і іншых пытаннях, якія датычаць працоўных і сацыяльна-эканамічных правоў работнікаў універсітэта, прымаюцца адміністрацыяй па ўзгадненню з камітэтам прафсаюза.

3.4. Захаваць у адпаведнасці з дзеючым палажэннем для прафесарска-выкладчыцкага саставу конкурсны парадак замяшчэння вакантных пасад.

З асобамі пенсійнага ўзросту дазволіць адміністрацыі заключаць працоўныя адносіны шляхам тэрміновых працоўных дагавораў на навучальны год.

**Адказн.** Кармазін А.П., Осіпава Т.І., на працягу года.

3.5. У выпадку вытворчай неабходнасці (папярэджанне стыхійнага бедства, вытворчай аварыі, няшчаснага выпадку, замяшчэння работніка, які часова адсутнічае) адміністрацыя мае права пераводзіць работніка на неабумоўленую працоўным дагаворам работу.

**Адказн**. Кармазін А.П., Осіпава Т.І., на працягу года.

3.6. Не дапускаць без згоды прафсаюзнага камітэта распродажу маёмасці універсітэта, якая спісваецца.

**Адказн.** рэктарат.

3.7. Адміністрацыя абавязуецца не здымаць арэндную плату і камунальныя

(Заканчэнне на 4-й стар.)

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

(Заканчэнне. Пачатак на 2-3-й стар.)

паслугі за выкарыстанне памяшканняў сталовай N3, кафэ пры сталовай N3 і сталовай N18 "Прадпрыемствы грамадскага харчавання" для правядзення ўрачыстых вечароў і вяселляў для супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў універсітэта.

## 4. ГАРАНТЫІ ЗАНЯТАСЦІ

4.1. Рэктарат абавязуецца:

4.1.1. Паведамляць у прафсаюзны камітэт не пазней, чым за тры месяцы, аб прадстаячай ліквідацыі або рэарганізацыі структурных падраздзеяленняў, калі гэта выкліча скарачэнне рабочых месцаў або пагаршэнне ўмоў працы. Праводзіць з прафсаюзным камітэтам перагаворы па захаванню правоў і законных інтарэсаў вызваляемых работнікаў.

4.1.2. Не дапускаць беспадстаўнага скарачэння работнікаў і рабочых месцаў, своечасова перапрафіліраваць ранейшыя і ствараць новыя рабочыя месцы.

4.2. Камітэт прафсаюза абавязуецца:

4.2.1. Ажыццяўляць кантроль за выкананнем заканадаўства аб занятасці, за тым, ці даюцца вызваляемым работнікам ільготы і кампенсацыі.

4.2.2. Не здымаць з прафсаюзнага ўліку вызваляемых работнікаў да іх працаўладкавання.

4.2.3. Скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве адміністрацыі па пунктах 1,2 арт.33 КЗаП Рэспублікі Беларусь праводзіцца з папярэдняй згоды прафсаюзнага камітэта, а па пунктах 3,4,5,6,7,8 арт.33,п.2,3 арт.254 КЗаП Рэспублікі Беларусь -- пасля папярэдняга, не пазней чым за два тыдні, паведамлення прафсаюзнага камітэта.

4.3. Тлумачэнне

прычын звальнення па ініцыятыве адміністрацыі па арт.33 КЗаП Рэспублікі Беларусь:

пункт 1 -- скарачэнне колькасці або штата работнікаў;

пункт 2 -- неадпаведнасць работніка займаемай пасадзе з прычыны недастатковай кваліфікацыі або стану здароўя, якія перашкаджаюць працягу дадзенай работы;

пункт 3 -- сістэматычнае невыкананне работнікам без уважлівых прычын абавязкаў, калі да яго раней прымаліся меры дысцыплінарнага або грамадскага ўздзеяння;

пункт 4 -- прагул без уважлівых прычын;

пункт 5 -- няяўка на работу больш 4-х месяцаў запар з прычыны часовай непрацаздольнасці;

пункт 6 -- аднаўленне на працу работніка, які раней выконваў гэту работу;

пункт 7 -- з'яўленне на рабоце ў нецвярозым стане, стане наркатычнага або таксічнага ап'янення;

пункт 8 -- здзяйсненне па месцы працы крадзяжу маёмасці наймальніка, устаноўленага ўступіўшым у законную сілу прыгаворам суда або пастановай кампетэнтнага органа аб накладанні адміністрацыйнага спагнання.

Па арт.254 КЗаП Рэспублікі Беларусь:

пункт 2 -- учыненне віноўных дзеянняў работнікам, які абслугоўвае грашовыя або матэрыяльныя каштоўнасці (страта даверу да яго з боку наймальніка);

пункт 3 -- учыненне работнікам, які выконвае выхаваўчыя функцыі, амаральнага ўчынку, несумяшчальнага з працягам дадзенай работы.

## 5. АХОВА ПРАЦЫ

5.1. Для забеспячэння нармальных умоў працы выканаць мерапрыемствы, прадугледжаныя пагадненнем па ахове працы (дадаткам N3).

5.2. Адміністрацыя абавязуецца на падставе спіса вытворчасцей, прафесій і пасад са шкоднымі ўмовамі працы прадстаўляць работнікам, якія маюць на гэта права, дадатковы водпуск і скарочаны рабочы дзень, а таксама забяспечваць бясплатную выдачу малака або іншых раўнацэнных харчовых прадуктаў, сродкамі індывідуальнай абароны (спецадзенне, аптэчкі, мыючыя сродкі).

**Адказн.** Кармазін А.П., Яўстраценка А.В., Пашук С.Я.

5.3. Адміністрацыя арганізуе ўтрыманне аўдыторый, лабараторый, вытворчых памяшканняў і рабочых месцаў, месцаў агульнага карыстання ў адпаведнасці з санітарна-гігіенічнымі нормамі і правіламі.

**Адказн.** каменданты вучэбных карпусоў, Папкова Н.І.

5.4. Штогод арганізоўваць праходжанне медыцынскага агляду работнікаў, якія працуюць у шкодных умовах працы.

**Адказн**. Варатніцкі Г.І., кіраўнікі падраздзяленняў.

5.5. Адміністрацыя універсітэта праводзіць інвентарызацыю плошчаў, замацаванне плошчаў за падраздзяленнямі, зыходзячы з санітарных норм і выконваемых функцый.

**Адказн**. Папкова Н.І.

5.6. Прафком сумесна з аддзелам кадраў і службай аховы працы і ТБ правяраюць рэалізацыю льгот для супрацоўнікаў, звязаных са шкоднымі ўмовамі працы.

**Адказн.** Кармазін А.П., Варатніцкі Г.І., Яўстраценка А.В.

5.7. На рабочым месцы ў выпадку парушэння ТБ рэктарат устанаўлівае персанальную адказнасць.

## 6. КУЛЬТУРНАЯ І СПАРТЫЎНА-МАСАВАЯ РАБОТА, АРГАНІЗАЦЫЯ АДПАЧЫНКУ

6.1. Прафком і адміністрацыя абавязуюцца наладжваць калектыўны прагляд супрацоўнікамі спектакляў у абласным драмтэатры, а для дзяцей -- цыркавых праграм, для дарослых арганізоўваць сумесныя сустрэчы Новага года, 8 Сакавіка, для дзяцей -- навагодніх ранішнікаў; па магчымасці выдзяляць сродкі для сумеснага святкавання найбольш знамянальных дат; для ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны праводзіць "Агеньчыкі" у гонар Дня Перамогі.

**Адказн**. прафком, рэктарат.

6.2. Прафком абавязуецца: аказваць садзейнічанне ў набыцці супрацоўнікам і іх дзецям пуцёвак у санаторыі, дамы і на базы адпачынку, у дзіцячыя лагеры. Своечасова даводзіць да ведама калектыву аб зменах парадку выдачы і аплаты пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку. Забяспечыць строгі кантроль за правільным размеркаваннем і выдачай пуцёвак на санаторна-курортнае лячэнне і адпачынак.

**Адказн.** прафком, камісія па аздараўленню.

6.3. Для супрацоўнікаў праводзіць масавыя спаборніцтвы па праграме "Здароўе", для студэнтаў -- круглагадовую спартакіяду.

**Адказн.** спартклуб.

## 7. ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАВАВЫХ ГАРАНТЫЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПРАФКОМА

7.1. Прэміраваць і аказваць матэрыяльную дапамогу вызваленым прафсаюзным работнікам у парадку і на ўмовах, устаноўленых для адпаведных кіраўнікоў, спецыялістаў і служачых.

7.2. Наймальнік прадастаўляе ў бясплатнае карыстанне для дзейнасці прафсаюза матэрыяльныя ўмовы (памяшканне, сродкі сувязі, аргтэхніку, транспарт, канцтавары, паперу, інвентар і інш.).

7.3. Прафсаюзныя ўзносы ў памеры 1% ад заработнай платы выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта адлічваць праз бухгалтэрыю. З іх: 20% пералічваць вышэйстаячай прафсаюзнай арганізацыі, 80% -- прафсаюзнай арганізацыі універсітэта.

7.4. Членам прафкома, не вызваленым ад асноўнай работы, даваць вольны час (3 гадзіны ў тыдзень) для выканання грамадскіх мерапрыемстваў у інтарэсах калектыву.

СПОРТ СПОРТ СПОРТ



## ІЗНОЎ ПЕРШЫЯ

У Гомелі завяршыліся фінальныя гульні па гандболу сярод жаночых каманд у праграме рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў.

Наша каманда "Універсітэт", настаўнікам якой з'яўляецца заслужаны трэнер Беларусі Валерый Крукоўскі, перамагла гандбалістак акадэміі фізічнага выхавання і спорту -- 41:28, Гродзенскага універсітэта -- 42:32, Брэсцкага універсітэта -- 34:19, Магілёўскага універсітэта -- 30:16 і Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі -- 37:8, упэўнена заняўшы першае месца.

## ДВА ЗАЛАТЫЯ, ВОСЕМ СЯРЭБРАНЫХ І ЧАТЫРЫ БРОНЗАВЫЯ МЕДАЛІ

Такі вынік выступлення зборнай каманды плыўцоў нашага універсітэта на рэспубліканскіх студэнцкіх гульнях, якія праходзілі ў Мінску.

У плаванні на 200 м на спіне атрымаў перамогу першакурснік факультэта фізічнай культуры Дзмітрый Шаўчук.

У камбінаванай эстафеце 4х100 м нашы студэнты Дзмітрый Шаўчук, Аляксандр Сайдакар, Ігар Карніенка і Васіль Ціклянкоў таксама падняліся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару.

У камандным заліку перамаглі студэнты акадэміі фізвыхавання і спорту, на другім месцы каманда нашага універсітэта.

Нагадаю, што трэніруе нашу каманду ст.выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту Барыс Гіль.

## ЗА МЯЖОЙ ПРЫЗЁРАЎ

У г.Гродна прайшоў веснавы лёгкаатлетычны крос у праграме рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў. З 28 каманд ВНУ нашы красмены занялі чацвёртае месца.

х х х

Напярэдадні Дня Перамогі па вуліцах Гомеля прайшла традыцыйная лёгкаатлетычная эстафета. Упершыню за многія гады наша каманда нечакана ўступіла камандзе Гомельскага вучылішча алімпійскага рэзерву.

**В.МАРЧАНКА.**

## СВЯТА НА СТАДЫЁНЕ

15 мая ў нашай краіне адзначаўся Дзень фізічнай культуры і спорту. Яму было прысвечана спартыўнае свята, якое адбылося на універсітэцкім стадыёне. Юнакі спаборнічалі ў падцягванні на перакладзіне, у перацягванні каната, дзяўчаты — у аджыманні. Цікава прайшла і камбінаваная эстафета ў бегу. Галоўны вынік спаборніцтваў — далучэнне студэнцкай моладзі да актыўных заняткаў спортам.

**Алексей ФЕСЬКОВ**

### *ВЕСНА*

*Ты, прилетев*
*На крыльях*
*Влажной тучи,*
*Вошла в мой мир*
*Желанною слезой.*
*Твой томный гром*
*И тысячи созвучий*
*То вглубь, то вширь*
*Бежали за грозой.*
*А я смотрю на рост*
*Весенних почек,*
*Прижмурив до краев*
*Зеленые глаза.*
*Где я ... в раю?*
*Или земли кусочек*
*Мне осветила*
*Не моя гроза?*

## АЛІМПІЯДА ПА АНГЛІЙСКАЙ МОВЕ

Кафедра англійскай мовы арганізавала і правяла алімпіяду па англійскай мове сярод студэнтаў нямоўных факультэтаў нашага універсітэта.

У алімпіядзе прынялі ўдзел 22 студэнты. Ім былі прапанаваны наступныя заданні: прачытаць тэкст і выканаць шэраг практыкаванняў; праслухаць 2 разы тэкст на англійскай мове, пераказаць яго і прадоўжыць самастойна канцоўку; пракаменціраваць адну з прыказак.

Амаль усе ўдзельнікі справіліся з прапанаванымі заданнямі, паказалі добрае валоданне англійскай мовай.

Пераможцамі сталі В.Грахольскі (гр.Ф.-24) і Д.Брусілаўскі (гр.Ф.-14), другое месца занялі Н.Стэльмах (гр. ЭК-11) і К.Шпікат (гр. ПМ-24). На трэцім месцы — І.Сурына (гр.-Б-21) і В.Алдошкін (гр. П-24).

Пераможцы атрымалі прызы.

**Г.БУРЦАВА,**
**выкладчыца кафедры англійскай мовы, адказная за правядзенне конкурсу.**

## ПА АКТУАЛЬНЫХ ПЫТАННЯХ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ РАБОТЫ

Па гэтай тэме ў нашым універсітэце адбылася двухдзённая канферэнцыя. Уступным словам яе адкрыў прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў.

На пленарным пасяджэнні з дакладамі выступілі дацэнт кафедры мат.аналізу У.В.Мухін і асістэнт кафедры педагогікі І.Т.Зайцава.

На канферэнцыі працавала 10 секцый. На кожнай з іх заслуханы і абмеркаваны дзясяткі паведамленняў, якія былі накіраваны на паляпшэнне навукова-метадычнай работы.

## ІДУЦЬ ГАДЫ, А ПАМЯЦЬ ЗАСТАЕЦЦА

Па даўняй і добрай традыцыі ў нашым універсітэце да Дня Перамогі ўшаноўвалі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, рады якіх, на жаль, з кожным годам змяншаюцца. Як і заўжды, ва універсітэцкім парку адбылося ўскладанне вянка і кветак да брацкай магілы загінуўшых патрыётаў. Іх памяць ушанавана мінутай маўчання.

Затым адбыўся святочны "Агеньчык" вызваліцеляў Радзімы. Рэктарат і прафком зрабілі ўсё для таго, каб гэта мерапрыемства пакінула ў яго ўдзельнікаў найлепшыя ўражанні і выклікала шчырую ўдзячнасць.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 214.
Падпісана да друку 22.05.98.